## КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ (1970–1980-Я ГГ.)

І.А. Пушкін (Магілёў, Беларусь)

Павышэнне ўзроўню кіраўніцтва эканомікай непарыўна звязана з паляпшэннем падбору, растаноўкі і выхавання кадраў, стварэння іх рэзерву. У савецкі час гэтымі пытаннямі займалася цэнтральнае і мясцовае кіраўніцтва КПСС-КПБ. Пры абласных выканаўчых камітэтах існавалі ўпраўленні мясцовай прамысловасці.

26.01.1940 г. быў створаны аддзел мясцовай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Яго дзейнасць была спынена ў 1941 г., адноўлена ў студзені 1944 г. 16.07.1953 г. ён быў аб’яднаны з аддзелам мясцовай паліўнай прамысловасці і на іх базе створана ўпраўленне мясцовай і паліўнай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, якое 10.05.1957 г. ліквідавана шляхам аб’яднання з упраўленнем прамысловасці харчовых тавараў ва ўпраўленне прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. У снежні 1962 г. ліквідавана, і на яго базе створана ўпраўленне прамысловасці (з лютага 1963 г. – упраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці) Віцебскага прамысловага аблвыканкама. Адноўлена ў снежні 1964 г. як упраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама. Пераўтворана: 29.10.1965 г. – у ўпраўленне мясцовай прамысловасці, 12.05.1993 – у Віцебскае вытворчае ўпраўленне мясцовай прамысловасці (Віцебскае АВУ «Віцмясцпрам») выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных (з 7.10.1977 г. – Савета народных дэпутатаў, з 15.03.1994 г. – Савета дэпутатаў, з 6.10.1994 г. – Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта) [2, с. 179].

Да прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці адносіліся: Віцебскае вытворчае аб’яднанне (ВА) будаўнічых матэрыялаў “Будаўнік”, Віцебскае ВА “Хімпласт”, Віцебскае тэкстыльнае ВА, Віцебскае швейнае ВА “Віцебчанка”, Аршанскі камбінат будматэрыялаў, Бешанковіцкая шорная фабрыка, Браслаўскае ВА будматэрыялаў, Дубровенскі камбінат прамысловых тавараў, Докшыцкі камбінат будматэрыялаў, Лепельскае дрэваапрацоўчае ВА, Варапаеўскі дрэваапрацоўчы камбінат, Віцебскае ВА надомнай працы, Пастаўскі завод па вытворчасці камплектаў абсталявання па чарчэнню і маляванню, Талочынская тэкстыльная фабрыка, Чашніцкі камбінат прамысловых тавараў [1, арк. 1; 6, арк. 63].

Агульная колькасць усіх работнікаў, якія былі занятыя ў асноўнай і дапаможнай дзейнасці прадпрыемстваў упраўлення мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама на 1.01.1987 г. складала – 10766 чал., на 1.01.1989 г. – 11329 чал. [3, арк. 23-23адв.]. У адпаведнасці ад займаемых пасад на 15.09.1987 г. гл. табл. 1.

Табліца 1

**Колькасць кіраўнікоў, рабочых, спецыялістаў і служачых упраўлення мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама на 15.09.1987 г.** [6, арк. 6-8]

| Назва пасады | Усяго па спісу | Групы прадпрыемстваў з колькасцю рабочых і служачых (чал.) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | ад 100 да 500 | 501 – 1000 | 1001 – 5000 |
| Усяго працаваўшых | 10913 | 1456 | 2117 | 6740 |
| Рабочых | 9788 | 1280 | 2388 | 6120 |
| Аховы | 38 | 6 | 15 | 17 |
| Усяго кіраўнікоў, спецыялістаў і служачых. З іх: | 1087 | 170 | 314 | 603 |
| Кіраўнікі (дырэктары, начальнікі самастойных прадпрыемстваў) | 13 | 5 | 4 | 4 |
| Намеснікі кіраўнікоў | 15 | 2 | 4 | 9 |
| Кіраўнікі вытворчых адзінак, якія ўваходзілі ў ВА несамастойнымі прадпрыемствамі | 11 | | 5 | 6 |
| Кіраўнікі аддзелаў | 55 | 6 | 15 | 34 |
| Начальнікі вытворчасцей і іх намеснікі | 6 | 3 | 1 | 2 |
| Начальнікі цэхаў і іх намеснікі | 14 | 1 | 2 | 11 |
| Майстры (старшыя майстры) | 266 | 43 | 83 | 140 |
| Галоўныя інжынеры, галоўныя механікі, галоўныя энэргетыкі | 35 | 5 | 15 | 15 |
| Інжынеры (акрамя інжынераў-эканамістаў) | 151 | 21 | 35 | 95 |
| Механікі, энергетыкі | 80 | 17 | 29 | 34 |
| Эканамісты | 64 | 9 | 18 | 37 |
| Галоўныя бухгалтары | 20 | 5 | 9 | 6 |

Репозиторий ВГУ

Як адзначаецца ў справаздачных дакументах, упраўленне мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама ў цэлым паспяхова выконвала план па асноўным тэхнічна-эканамічным паказчыкам. Але часцяком прадпрыемствы, падначаленныя ўпраўленню, прынімалі заніжаныя планы, у выніку чаго адбывалася іх рэзкае перавыкананне і выплата вялікіх прэмій кіраўніцтву прадпрыемстваў. Напрыклад, на Віцебскім і Браслаўскім ВА будматэрыялаў, Бешанковіцкай шорнай фабрыцы і інш. [8, арк. 53-54]

У дакладзе "О состоянии и мерах дальнейшего улучшения работы с кадрами в свете решений XXIV съезда КПСС" на XI пленуме Віцебскага АК КПБ (1972) было адзначана, што асабліва нізкі ўзровень падрыхтоўкі кадраў быў на прадпрыемствах мясцовай і харчовай прамысловасці, бытавога абслугоўвання. У Віцебскай вобласці 13% кіраўнікоў прадпрыемстваў прамысловасці не мелі спецыяльнай адукацыі і толькі 41,6% з'яўляліся спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі, 11,4% галоўных спецыялістаў, 13,2% начальнікаў цэхаў, 32% начальнікаў смен, участкаў, цэхавых лабараторый і іх намеснікаў не мелі спецыяльнай адукацыі. Адзначаўся нізкі ўзровень спецыяльнай падрыхтоўкі работнікаў эканамічных службаў. 54,9% галоўных і старэйшых бухгалтараў, 76% бухгалтараў, 23% эканамістаў на прадпрыемствах прамысловасці – практыкі, шмат хто з нясконачанай сярэдняй адукацыяй. Назіралася высокая цякучасць кадраў [5, арк. 12-13].

За наступныя дзесяць-пятнаццаць год удалося палепшыць становішча за кошт прыняцця на працу маладых спецыялістаў і абучэння без адрыву ад вытворчасці. На прадпрыемствах мясцовай прамысловасці вобласці за 1986–1988 гг. вага практыкаў, якія займалі пасады кіраўнікоў і спецыялістаў, паменшылася з 20,8% да 13,4%, узровень меўшых вышэйшую адукацыю павялічыўся з 23,8% да 31% або ў 1,3 разы, у тым ліку займаючых пасады кіраўнікоў з 24,3% да 33%, прычым колькасць кіраўнікоў у цэлым па ўпраўленню мясцовай прамысловасцю Віцебскага аблвыканкама скарацілася з 461 чал. да 449 чал. Аднак пры агульным скарачэнні практыкаў па ўпраўленню да 13,4%, вага практыкаў, якія займалі пасады спецыялістаў на пэўных прадпрыемствах заставалася высокай: Варапаеўскі ДАК – 25,5%, Браслаўскае ВАБМ – 23,5%, Лепельскае ПДА – 20%. Асабліва шмат іх было сярод бухгалтараў 28 %. З другой паловы 1980-х гг. стала памяншацца цякучасць кадраў. У 1986 г. яна складала 12,8%, у 1987 – 11%, 1988 – 9,3%, што было ніжэй чым у цэлым па міністэрству мясцовай прамысловасці. Але на шэрагу прадпрыемстваў заставалася на ўзроўні 1987 г. і нават узрасла: Віцебскае ВАБМ – 15,7%, Бешанковіцкая шорная фабрыка – 14,9%, "Віцебчанка" – 13,1% [8, арк. 53-54]. Яшчэ адной праблемай былі страты працоўнага часу з-за прагулаў, якія ўвесь час павялічваліся і, напрыклад, у 1988 г. ва ўпраўленні мясцовай прамысловасцю Віцебскага аблвыканкама яны склалі – 777 чал.дзён (1987 – 673, рост на 15,5%), асабліва на Віцебскім ВА будматэрыялаў, дзе рост склаў 81,8%: 291 і 160 чал.дзён адпаведна [8, арк. 54].

Не было належнага патрабавання і высокай прынцыповасці ў адзнакі дзейнасці кіраўнікоў. Часта замена работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, што не давала жаданага выніку. Напрыклад, намеснік начальніка ўпраўлення мяцовай прамысловасці І. Левін быў вызвалены ад пасады за злоўжыванне службовым становішчам, але адразу быў прызначаны дырэктарам хімзавода, затым намеснікам генеральнага дырэктара ВА "Хімпласт", праз некалькі месяцаў Чыгуначным РК КПБ г. Віцебска быў рэкамендаваны на пасаду дырэктара завода жалезабетонных вырабаў трэста "Віцебскаблсельбуд". І ў хуткім часе быў вызвалены ад пасады, як не справіўшыйся з працаю [5, арк. 14-15].

Менавіта ў тым, што на прадпрыемствах працавала шмат людзей без спецыяльнай падрыхтоўкі, так званыя "практыкі", партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва бачыла адну з асноўных прычын недахопаў у вытворчасці. Так, на яго думку, з-за кадравых праблем у Віцебскай вобласці за 10 месяцаў 1972 г. 40 прамысловых прадпрыемстваў (14,7%) не выканалі план па рэалізацыі прадукцыі, 62 прадпрыемствы па прадукцыйнасці працы. На 45 прамысловых прадпрыемствах прадукцыйнасць працы значна паменшылася ў параўнанні з 1971 г.: Аршанскім мелькамбінаце № 1, Глыбокскім малочна-кансервавым камбінаце, Міёрскім мясакамбінаце і інш. Пры гэтым за 1970–1971 гг. змянілася 35% дырэктароў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў. З 110 практыкаў, якія займалі пасады кіраўнікоў на заводах і фабрыках Віцебскага абласнога ўпраўлення мясцовай прамысловасці, толькі 8 вучыліся ў ВНУ, з 173 ІТР, якія не мелі спецыяльнай адукацыі, толькі 4 вучыліся ў тэхнікумах [5, арк. 15-16].

З 22 прадпрыемстваў, абследаваных за ІІІ квартал 1972 г. 10 выпускалі прадукцыю з парушэннем патрабаванняў стандартаў і тэхнічных умоў [5, арк. 16]. Сітуацыя з якасцю тавараў не паляпшалася і ў наступнае дзесяцігоддзе. На прадпрыемствах мясцовай прамысловасці (1987) не было вырабаў, якія адпавядалі патрабаванням вышэйшай катэгорыі якасці. Марудна ішоў працэс абнаўлення асартымента. За 1986 г. з'явілася 130 новых відаў тавараў – 26% ад агульнай колькасці, пры штогадовым заданні – 35%. Тавары палепшанай якасці і асабліва модныя выпускалі толькі 3 прадпрыемствы з 13, удзельная вага такой прадукцыі ў агульным аб'ёме тавараў народнага спажывання складала ў 1986 г. – 5,6%, у першым паўгоддзі 1987 г. – 9,7% (па ўсіх прамысловых прадпрыемствах вобласці гэты паказчык складаў – 19,4%). За 1986 г. 10 прадпрыемстваў з 13 атрымалі 111 рэкламацый на дрэнную якасць прадукцыі, па якіх было выплачана штрафаў на 37 тыс. руб. (1985 год – 91 рэкламацыя і 28,2 тыс. руб. штрафа). Адзначаўся высокі ўзровень ручной працы. На Браслаўскім ВАБМ – 55,2%, ВА "Хімпласт" – 34%, па ўпраўленню мясцовай прамысловасці – 29% [7, арк. 57-61].

Репозиторий ВГУ

Вывучэнне архіўных матэрыялаў аб дзейнасці мясцовай прамысловасці дазволіла выявіць пэўныя праблемы ў складзе, фарміраванні і растаноўцы кадраў на прадпрыемствах у 1970–1980-я гг. – перыяд буйнага прамысловага развіцця БССР, што неабходна для аб’ектыўнага аналізу, з пункту гледжання гістарычнага вопыту, кадравай палітыкі дзяржаўнай улады і шляхоў фарміравання, зместу і ўдасканалення кадравага патэнцыялу прамысловасці сучаснай Беларусі.


1. Анализ выполнения пятилетнего плана 1986–1990 гг. предприятиями управления местной промышленности Витебского облисполкома // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 119.
2. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006 / сост. Т.В. Буевич, Ю.С. Петухов. – Минск: Медисонт, 2011. – 936 с.
3. Отчёт о численности, составе и движении работников занимающих должности руководителей и специалистов за 1988 год // ДАВц. – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 210.
4. Отчёт о численности, составе и движении работников занимающих должности руководителей и специалистов за 1986 год // ДАВц. – Ф. 2856. Воп. 6. Спр. 286.
5. Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. – Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8.
6. Сводный отчёт промышленных предприятий местной промышленности Витебской области на 15.09.1987 г. // ДАВц. – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 62.
7. Справка о работе руководства и производственных объединений управления местной промышленности по повышению качества товаров народного потребления и более полному удовлетворению потребностей населения (1987) // ДАВц. – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 119.
8. Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины, совершенствованию организации труда в объединениях и на предприятиях Витебского облместпрома (1989) // ДАВц. – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189.


Репозиторий ВГУ